# ТЭКСТ ДЛЯ ВОДГУКУ

## *АГОНЬ*

У чыстым полі тлеў жар. Ён мігцеў на ветры і відзён быў здалёк. Стаяла цішыня і ноч. Па небе цягнуліся хмары, і часамі яснела там, дзе павінен быў быць месяц.

Чуўся стук хады ў полі. Відаць, той, хто ішоў, абуты быў у цяжкі абутак. Ён высокі і як бы прысутулены. Ішоў шпарка, проста туды, дзе тлеў жар.

Высокая і прысутуленая постаць ужо бадай што бегла. Яна адразу кінулася да цяпла, у тое вузкае месца, дзе дрыжала слабае святло.

Гэта быў нейкі абарванец. Худы, танканосы, брудны і абраслы. Рукавы на яго доўгіх руках былі чамусьці кароткія. Галава хілілася набок.

Чалавек гэты ўкленчыў перад жарам, працягнуў да яго рукі з растапыранымі пальцамі. Прыгнуўся тварам у самы жар і так застыў. Відно было, што холад працінаў яго. Агонь узнімаўся і браўся далей. Вецер раздзьмухваў яго. Вецер пачаў шумець мацней. Навокал агню стаяла сцяна цемені. І здавалася, што поўная адзінота, непераможная, як далечыня свету, пануе тут і ўсюды.

Раптам агонь успыхнуў. Агонь стаў сцяной, цемень рушыла далей, стала прасторна і ясна. Чалавек стаяў на каленях, як і раней, але выпрастаўся і падняў рукі ўгару. Вызначалася чорнае бярвенне, абкуродымленыя печы, абгарэлыя слупы. Агонь браўся далей і шырэй, і ўсё больш разыходзілася кола святла. На ўсю далечыню зноў пачынала гарэць вялікае пажарышча. І раптам вызначыліся два абгарэлыя трупы. Тады яны не згарэлі да канца. Цяпер агонь зноў дабіраўся да іх. Прысутулены і высокі чалавек шпарка пайшоў у чорнае бяздонне свету. Жах адзіноты апаноўваў яго. І раптам ён убачыў не кранутую агнём хату. Праўда, і сцены, і дрэва былі абсмалены, але ўсё стаяла на месцы. Прысутулены дабраўся да дзвярэй і хапіўся за клямку. Сенцы былі без вокан і зусім пустыя. Толькі доўгі тапчан стаяў паўз адну сцяну і на канцы яго гарэла самаробная свечка.

На другім канцы тапчана сядзела маладая жанчына ў кароткім кажушку і каляровай вялікай хустцы на галаве. Яна ўздрыганулася, калі высокая постаць увайшла ў сенцы.

– Немец, божачка! – крыкнула яна і ўсхапілася з месца.

Яна стаяла перад нечаканым госцем, выцягнуўшы ўніз рукі і не зводзячы з яго вачэй.

– Чаго ты, чаго ты, ідзі! – зноў крыкнула яна.

Прысутулены падняў рукі ўгару і прагаварыў:

– Я толькі выспацца, да раніцы. Я трое сутак не спаў. Я ўміраю з голаду. Ты жанчына. Можа і ў цябе ёсць муж ці брат. Можа і ён так дзе... Накармі мяне. Дай адаспацца. Я табе зла не зраблю. Цяпер ноч, пустэча. А пасля я пайду. Я больш ваяваць не буду, можа я дапаўзу яшчэ як да Германіі, да роднага дома, да дзяцей. У мяне трое дзяцей. Я быў хворы і астаўся ад часці, калі яна адступала.

– Ты хочаш дайсці да сваіх дзяцей? А я да сваіх дзяцей ужо не дайду. Яны сатлелі жывыя ў агні.

Жанчына закрыла твар рукамі і зарыдала. Нямецкі твар зварухнуўся. Пячаць надзеі лягла на яго твар. Гора жанчыны магло стаць яму апірышчам. Ён ступіў крок наперад. Жанчына шатнулася ўбок. Немец сказаў:

– Скончыцца вайна, і ты забудзеш.

– Не забуду! – крыкнула жанчына.

– Гора пройдзе, – гаварыў немец, – час залечыць душу... (Тут ён змоўк і падумаў.) Ты яшчэ маладая... (Ламаная яго мова гучала ціха.) Мне хоць хлеба дай... хоць чаго... Зіма... пустэча... ноч...

Стараючыся ўсміхацца, ён асцярожна падышоў да тапчана і сеў на яго.

– Ты раіш мне, як лячыць душу! – сказала жанчына.

Немец кіўнуў галавой. Жанчына, не даючы яму апамятацца, хапіла з кута гліняны збанок і апусціла яго з вялікага размаху яму на галаву. Яна пабегла на двор і, толькі выбегшы з сянец, убачыла, што пажар даядае асмалкі. Яна падняла камень. Немец пабег з сянец. Яна сустрэла яго каменем у твар. Немец упаў ля самага парога, тварам у мёрзлую зямлю, раскінуўшы рукі. Асветлены пажарам, ён і нежывы як быццам бы ўцякаў.

*Паводле Кузьмы Чорнага*
*1943*